# ЭМАТЫКОНЫ ЯК СРОДАК КАМУНІКАЦЫІ

**М. С. Цюцянькоў**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*tyutenkovm@mail.ru;*
*навук. кір. – В. А. Горбач, канд. філал. навук, дац.*

Эматыконы займаюць значнае месца ў мабільнай камунікацыі і сацыяльных сетках, з'яўляюцца сучасным невербальным сродкам афармлення інфармацыі ў інтэрнэт-зносінах. Галоўная функцыя эматыконаў – перадаць праз пазамоўныя сродкі эмацыйны стан суразмоўцы. У матэрыяле разглядаюцца асноўныя функцыі і метады выкарыстання эматыконаў. На падставе навуковай літаратуры тлумачыцца іх уключанасць у розныя тыпы пісьмовых тэкстаў.

***Ключавыя словы:*** эматыконы ў сацыяльных сетках; невербальныя зносіны; экспрэсіўна-эмацыянальная афарбоўка слова.

Адлюстраванне ўласных эмоцый праз смайлікі сёння з'яўляецца нормай сярод пакалення Z. Эматыконы выконваюць важную ролю ў паўсядзённых зносінах, якія выразна дэманструюцца ў перапісках у сацыяльных сетках або ў тэкстах форумаў. Гэты від невербальных знакаў візуалізуе эмоцыі чалавека. Аднак лінгвісты адзначаюць, што ў функцыянаванні смайлікаў ёсць абмежаванні, паколькі праз іх немагчыма цалкам перадаць увесь працэс камунікацыі. Эматыконы не могуць дэтальна і дакладна перадаць асаблівасці перапіскі, пабудову і кампазіцыю тэкстаў удзельнікаў пісьмовага маўлення. Яны хутчэй дапамагаюць упрыгожыць змест, дапаўняюць яго спецыфічнай вобразнасцю.

Часта пісьмовым тэкстам не хапае дастатковай эмацыянальнасці і экспрэсіўнасці пры перадачы інфармацыі ў электронным выглядзе, цяжка весці паўнавартасны дыялог. Адсюль можна зрабіць выснову, што эматыконы – гэта невербальныя сродкі экспрэсіі ў зносінах. Яны ажыўляюць узаемасувязь суразмоўцаў, тым самым кампенсуюць адсутнасць выразных сродкаў мовы, перадаюць асаблівасці інтанацыі, лагічнага націску ў маўленні. Сёння ў сацыяльных сетках важна максімальна хутка і лаканічна перадаць інфармацыю. У гэтых мэтах і выкарыстоўваюцца смайлікі.

Самі тэкставыя паведамленні складаюцца з двух кампанентаў: вербальнага (слоўнага), калі перадача інфармацыі праз электронныя зносіны адбываецца праз асаблівасці падачы дыялагічнага маўлення, і невербальнага. Да другога (невербальнага) кампанента, як важнага складніка, адносяцца, у першую чаргу, эматыконы. Эматыконы дазваляюць перадаць, дапоўніць зместава кантэкст паведамленняў. Функцыянальнае прызначэнне такіх невербальных знакаў – экспрэсіўна

ўзбагаціць зносіны, дэталізаваць сэнс выказвання, удакладніць і ўдасканаліць экспрэсіўна-эмацыйную афарбоўку маўлення ўдзельнікаў акта камунікацыі.

Эматыконы – (ад англ. emoticon, emotion icon – абразок з эмоцыяй), піктаграма, якая адлюстроўвае эмоцыю; часцей за ўсё складаецца з друкарскіх значкоў. Шырокае распаўсюджанне такога выгляду значкі атрымалі ў SMS-паведамленнях і інтэрнэце [1]. Яны могуць быць выкарыстаны ў якасці сродку хуткай перадачы свайго настрою пры камунікацыі. А іх выкарыстанне можа расказаць пра самога суразмоўцу. Напрыклад, як адзначаюць псіхолагі, 78 % жанчын выкарыстоўваць эматыконы, а сярод мужчын – толькі 60 %. Гэта сведчыць аб тым, што жанчыны больш эмацыйныя.

Эматыконамі чалавецтва карыстаецца ўжо на працягу 38 гадоў. Упершыню яны былі ўведзены ў 1982 годзе Скотам Фалманам. Вучоны адправіў сваім калегам электроннае паведамленне, у якім прапанаваў ужыць смайлік для перадачы эмоцый у сеткавых зносінах. Па даследаваннях на 2010 год Яндэкс падлічыў агульную колькасць смайлікаў у інтэрнэце. Іх колькасць налічвала больш за 3,8 млрд: радасных смайлікаў больш за 3 млрд, сумных – каля 700 млн [2]. Паводле адзначанага даследавання [2] сёння ў інтэрнэце смайлікі можна сустрэць на кожным шостым інтэрнэт-партале.

У сучаснай параграфеміцы вылучаюць некалькі відаў эматыконаў, якія згрупаваны ў тэматычныя ўкладкі: эмоцыі; жэсты, міміка, дзеянні і стан чалавека, а таксама розныя персанажы, жывёлы, ежа, прырода і г. д. Кожны год спіс смайлікаў пашыраецца. Толькі ў 2020 годзе было зроблена 117 смайлаў, а такія спісы актыўна папаўняюцца новымі. У 2019 годзе ў рамках Emoji 12.1 з'явілася 138 новых гендарна-нейтральных смайлікаў, актыўна ўключаецца гендарная альтэрнатыва.

Эматыконы з'яўляюцца ўзнаўленнем пачуццёвых адносін паміж людзьмі ў віртуальным свеце. Бо калі ў рэальных стасунках з суразмоўцам у знак адабрэння мы пасылаем усмешку, то ў віртуальных зносінах – дзве кропкі і дужку – :). Самымі папулярнымі смайлікамі з'яўляюцца наступныя эматыконы: :-) – усмешлівы; :-( – сумны; :-[ – злосны; :-0 – здзіўлены; : -* – пацалунак; ;-) – падміргванне. У сувязі з тым што слоўная інфармацыя ў сацыяльных сетках і мэсэнджэрах зводзіцца да мінімуму, то, як і ў вуснай форме маўлення, некаторыя эматыконы набываюць спрошчаны выгляд, некаторыя падаюцца скарочана праз адзін значок : ) – усмешка; ( – крыўда; ;) – падміргванне; D – шырокая ўсмешка.

Сёння смайлікі могуць выкарыстоўвацца не толькі ў сацыяльных сетках, але і ў мастацкіх творах. Яскравым прыкладам служыць

пераклад рамана «Мобі Дзі» у графічную форму, зробленую дата-інжынерам Фрэдам Бэненсанам [3]. На такую невербальную мову знакаў была перакладзена Біблія, усе яе 66 кніг: ад Быцця да Адкрыцця [4].

Калі больш дэталёва разглядаць сучасныя смайлікі, то найбольш гэта выявы тварыкаў, складзеных з лічбаў, літар, графічных знакаў і іншых сімвалаў на клавіятуры, якія ў сваёй цэласнасці ствараюць пэўныя сімвалы камунікацыі. Сёння смайлікі з'яўляюцца адным з прыярытэтных і ўдалых спосабаў зносін пры віртуальным кантакце. Намі было праведзена сацыялагічнае даследаванне, у ім прынялі ўдзел каля 50 рэцыпіентаў-студэнтаў БДУ і якое паказала, што практычна кожны карыстальнік мэсэнджэраў і сацыяльных сетак актыўна ўжывае смайлікі: 83 % – «так», 17 % – «не». А самым папулярным з'яўляецца эматыкон «смех скрозь слёзы».

Значэнне і назва некаторых эматыконаў можа значна адрозніваецца ў залежнасці ад краіны, у якой знаходзіцца суразмоўца, сацыяльнага статусу і кантэксту.

У сучаснай моўнай культуры пакуль не існуе пэўнай нормы скарыстання гэтых невербальных знакаў, якая павінна рэгуляваць размяшчэнне эматыконаў на пісьме. Таму яны могуць размяшчацца як у сярэдзіне, так і ў канцы сказа або фразы. Падчас інтэрнэт-камунікацыі ўключанасць смайліка часта супадае з пастаноўкай знака прыпынку, бо гэты від параграфем перадае лагічна завершаныя па сэнсе фрагменты выказвання. Аднак дакладнае размяшчэнне знакаў не заўсёды назіраецца ў перапісках, і часам заўважаецца прыватны спосаб перадачы невербальных зносін, які зразумелы толькі аўтару і яго сумоўцу. Падобны пазамоўны слэнг можа прывесці да з'яўлення новых, не зусім апраўданых сродкаў афармлення і перадачы думкі на пісьме, якія заслугоўваюць больш пільнай увагі з боку навуковых даследаванняў.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Эмотикон // ВикипедиЯ. URL: https://ru.wikipedia.org/wiki/Эмотикон (дата обращения: 18.03.2020).
2. Сколько улыбок в Интернете // Интерфакс URL: https://www.interfax.ru/business/130486 (дата обращения: 21.03.2020).
3. Грусть и радость! Эмодзи и Пасха! // speelogroup URL: https://speelogroup.com/blog/grust-i-radost-emodzi-i-paskha/ (дата обращения: 20.03.2020).
4. Библию перевели на язык смайликов-эмодзи из соцсети // KV.by URL: https://www.kv.by/content/341536-bibliyu-pereveli-na-yazyk-smailikov-emodzi-iz-sotsseti (дата обращения: 20.03.2020).